

**Упершыню на парадзе**

СТАР. 3



**Сакрэт прыцягнення зямлі**

СТАР. 4



**Адраджэнне Навагрудскага замка**

СТАР. 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родная мове

# ЗВЯЗДА

24 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 116 (27726) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

### Нацыянальная акадэмія навук зоймецца распрацоўкай стратэгіі перспектыўнага развіцця эканомікі Беларусі да 2030 года

**Гэтае пытанне абмяркоўвалася падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Прэзідыума НАН Уладзімірам Гусаковым, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць аб шэрагу важных пытанняў, у вырашэнні якіх удзельнічае Акадэмія навук, у тым ліку аб праектах у сферах эканамічнай і ваеннай бяспекі. Акрамя таго, абмеркаваны арганізацыйныя пытанні ў дзейнасці НАН, у прыватнасці, звязаныя з выбарамі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў. «Павінна быць усё строга па законе і сумленна, каб навукоўцы нас не папракалі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Як паведаміў журналістам па выніках сустрэчы Уладзімір Гусакоў, ён далажыў Прэзідэнту аб ходзе выканання даручэнняў, дадзеных кіраўніком дзяржавы падчас наведвання Акадэміі навук у сакавіку гэтага года. «У НАН распрацавана сістэма захадаў, якую мы цяпер рэалізуем у плане аптымізацыі структуры і колькасці, ратацыі, амаладжэння кадраў, павышэння заработнай платы і галоўнае — выніковасці, каб НАН была інтэграваная ў эканоміку краіны», — распавёў старшыня Прэзідыума НАН.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову, каб Акадэмія навук прыступіла да распрацоўкі стратэгіі перспектыўнага развіцця эканомікі краіны да 2030 года. Пры гэтым, нягледзячы на навуковы характар такой стратэгіі, яна не павінна быць адарвана ад практыкі.

## КЛОПАТЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА РЭГІЁНА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам Шапірам, на якой у тым ліку абмяркоўваліся вынікі работы эканомікі рэгіёна за мінулы перыяд 2014 года, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У першую чаргу кіраўнік дзяржавы пацікавіўся пытаннямі аптымізацыі. «Усё павінна быць разумна і прыносіць грошы. Гэта галоўнае», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што па сваім патэнцыяле Мінскі рэгіён практычна параўнальны з паловай краіны. «Як ідуць справы ў Мінскай вобласці, у тым ліку ў прамысловасці? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Пры гэтым не трэба забываць, што прадпрыемстваў, якія нібыта не камунальнай уласнасці, у Мінскай вобласці для губернатара няма. Яны ўсе важныя, усе маюць значэнне, і за ўсе губернатар нясе адказнасць».

Акрамя таго, Прэзідэнт запатрабаваў далажыць аб рабоце па нарыхтоўцы і забеспячэнні якасці кармоў у сельскай гаспадарцы.

Сямён Шапіра падрабязна далажыў кіраўніку дзяржавы аб развіцці рэгіёна. Паводле яго слоў, нягледзячы на адставанне ў першым квартале бягучага года, па выніках пяці месяцаў валавы рэгіянальны прадукт дасягнуў 104,2% да ўзроўню 2013 года. Нядрэнна спрацавала і прамысловасць — 106%, хоць па асобных напрамках і прадпрыемствах яшчэ неабходна прыкласці намаганні для павышэння эфектыўнасці.

## МАЛІТВА АБ ХРАМЕ





Фота БЕЛТА.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Помнік прападобнаму Сергію Раданежскаму адкрыўся ўчора ў новым сталічным мікрараёне Брылевічы. Манумент, які асвяціў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, усталяваны на тэрыторыі прыхода ў гонар прападобнага Сергія Раданежскага (вул. Каралінская). Цырымонія адкрыцця і асвячэння помніка, на якой прысутнічалі кіраўнікі парламента і ўрада, — адзін з этапаў у рэалізацыі цэлага храмавага комплексу. Прадстаяцель Беларускай Праваслаўнай Царквы таксама заклаў капсулу ў падмурак будучага храма. На тэрыторыі прыхода ўжо пабудавана невялікая царква, цяпер у перспектыве будаўніцтва вялікага храма. У бліжэйшыя месяцы завершыцца яго праектаванне.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік генеральнага дырэктара МАГАТЭ Аляксандр БЫЧКОЎ:**

***«Хачу шчыра падзякаваць калегам з Беларусі. МАГАТЭ сумесна з беларускімі і запрошанымі экспертамі выконвала для Беларусі шэраг даследаванняў па ацэнцы нацыянальнай атамнай праграмы — энергетычнае планаванне, вывучэнне ўстойлівасці ядзерна-энергетычнай сістэмы на працяглы перыяд, аналіз інфраструктуры для будаўніцтва першай АЭС — і дало шэраг рэкамендацый. Уся гэтая інфармацыя даступная для насельніцтва, грамадскіх арганізацый і палітыкаў! Усе звесткі можна знайсці ў інтэрнэце, і гэта вельмі важна».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10180,00 | ■ |
| Еўра | 13840,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 297,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 855,18 | ▼ |

■ Надвор'е

## ПАЦЯПЛЕЕ ТОЛЬКІ НА ВЫХАДНЫЯ

**І на гэтым тыдні ў Беларусі захаваецца няўстойлівае і не зусім цёплае надвор'е, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У наступныя двое сутак прыток халоднага паветра ў нашу краіну працягнецца. У сераду па поўначы, а ў чацвер на большай частцы краіны чакаюцца непрацяглыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Уначы стане ўвогуле холадна, калі тэмпература паветра ўсталюецца ў межах ад 2 да 10 цяпла. Удзень у сераду прагназуецца плюс 12-18 градусаў, на поўдні — да 20 цяпла. У сераду чакаецца ад плюс 14 да 21 градуса вышэй за нуль. Захаваецца дажджлівае надвор'е ў нашай краіне і ў пятніцу, калі па паўднёвым усходзе прагназуюцца нават моцныя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу плюс 5-12 градусаў, удзень — 14-21 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя да нас пачне вяртацца лета. У суботу дажджы чакаюцца толькі месцамі па краіне, але ўдзень магчымы навальніцы. Пацяплее, аднак уначы на суботу будзе толькі 3-10 цяпла. Тэмпература паветра ўдзень павялічыцца да 18-24, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да 26 цяпла. Прагназуюцца кароткачасовыя дажджы ў нас і ў нядзелю, але стане яшчэ цяплей. Уначы на нядзелю будзе плюс 6-13, удзень — 18-25 цяпла, а па поўдні прыгрэе нават да плюс 26-28.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Малюем мір

## ВЫРАЗНЫ ГОЛАС ДЗЯЦЕЙ

**Да канца месяца ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі можна будзе пазнаёміцца з малюнкамі школьнікаў Беларусі і Азербайджана.**

Тэма выставы «Дзеці за мір!» заўсёды была і застаецца самай шчырай, шчымлівай. Таму кожны з больш як 80 твораў — гэта жывое ўвасабленне прыгажосці, дабрыні, цеплыні, аб якіх пастаянна трэба нагадваць дарослым. Ідэю падобнай выставы рэалізавалі КДБ Беларусі і Міністэрства нацыянальнай бяспекі Азербайджана.

СТАР. 2



■ Грошы — у справу

## МАЛА АТРЫМАЦЬ ФІНАНСЫ

### Трэба яшчэ імі правільна распарадзіцца

**Хто дасць грошай фермеру-пачаткоўцу? Хіба што добры сусед. Але ж дзе такіх суседзяў на ўсіх набрацца? У банк не пойдзеш, бо не можаш даць ім справаздачу па дзейнасці (ты ж яшчэ толькі пачынаеш)... Аказваецца, што ёсць выйсце, — мікрафінансаванне. Прычым спецыялізаванае, адаптаванае менавіта для сельскай мясцовасці. І каб усё гэта лепей функцыянавала ў нашай краіне, днямі Рэспубліканскі мікрафінансавы цэнтр пры падтрымцы USAID пачаў рэалізацыю праекта «Паляпшэнне доступу да фінансавых рэсурсаў сельскага насельніцтва Беларусі».**

### ПЛАНУЙ СВАЮ БУДУЧЫНЮ

Праект мае на мэце не толькі пашырэнне доступу сельскага насельніцтва краіны да пазыковых грашовых сродкаў, але і на павышэнне фінансавай адукаванасці ды развіццё прадпрымальніцкіх навыкаў. Мэты будуць дасягацца шляхам правядзення мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё мікрапрадпрымальніцтва ў сельскіх раёнах Мінскай і Брэсцкай абласцей, а таксама на стварэнне спрыяльных умоў дзейнасці і фарміраванне нарматыўна-прававой базы для мікрафінансавання. Праект, на думку арганізатараў, палепшыць інвестыцыйныя магчымасці ў сельскай мясцовасці, умацуе ролю мікрапрадпрыемстваў у вытворчых ланцужках, будзе спрыяць сельскаму развіццю, паскорыць эканамічны рост праз падтрымку прыватных прадпрыемстваў і прадпрымальніцтва, а таксама ўнясе ўклад у павелічэнне даходаў хатніх гаспадарак і ажывіць сельскія суполкі. Перыяд рэалізацыі праекта — 4 гады. Бюджэт — 1,475 млн долараў. На што ж пойдуць гэтыя грошы?

СТАР. 5

## СВЕТУ НЕ ПАТРЭБНА ВАЙНА




Фота БЕЛТА.

**22 чэрвеня мы ідзём у Брэсцкую крэпасць не толькі каб успомніць вайну... Найбольш, каб сказаць, што вайна нікому не патрэбна, што яе быць не павінна.**

Вось і сёлета моладзь Брэста правяла маштабную рэканструкцыю падзей чэрвеня 1941 года. Цяпер, як і тады, 21-га была субота. Па вуліцы Савецкай гулялі дзяўчаты ў сукенках у гарошак і белых шкарпэтках. Галантныя хлопцы дарылі ім сціплыя букеты. А ў парку іграў духавы аркестр. Сёлета брастаўчан парадаваў музыкай мінулых гадоў Эдуард Арцем'еў.

А ноччу ваенна-гістарычны клуб «Гарнізон» паказаў удзельнікам мерапрыемства эпізод абароны дзявятай памежнай заставы пад камандаваннем лейтэнанта Кіжаватава. У маштабнай рэканструкцыі варожага нашэсця ўдзельнічалі не толькі брастаўчане, але і іх таварышы з іншых гістарычных клубаў Беларусі і Расіі.

У чатыры гадзіны раніцы, як і заўсёды, пачаўся мітынг. Пасля кароткіх і ёмістых прамоў на ваду Буга былі спушчаны вянкі — як сімвал смутку па ахвярах вайны. На мітынг-рэквіем прыйшлі тысячы людзей, было шмат гасцей Брэста з гарадоў-пабрацімаў.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕС АДПРАВІЦЬ ПАЛІЦЭЙСКУЮ МІСІЮ ВА УКРАІНУ

Еўрасаюз накіруе ва Украіну паліцэйскую місію. Пра гэта паведамляе ІТАР-ТАСС са спасылкай на кіраўніка МЗС Літвы Лінаса Лінкявічуса. Адпаведнае рашэнне прынялі міністры замежных спраў краін ЕС. Задачай місіі, як сцвярджаецца, стане садзейнічанне рэформам праваахоўных органаў ва Украіне. Тэрмін яе працы складзе два гады. «Фарміраванне місіі пачнецца неадкладна, яна зможа адправіцца ў бліжэйшы час», — адзначыў Лінкявічус. Раней ІТАР-ТАСС, спасылаючыся на крыніцу ў еўрапейскай знешнепалітычнай службе, паведамляў, што місія будзе нацэлена на дапамогу Украіне ў правядзенні рэформаў. Яна будзе падобная да той, якую раней адпраўлялі ў Косава.




### КІТАЙ БУДУЕ НАЙБОЛЬШУЮ КОЛЬКАСЦЬ АЭС

Найбольш маштабную праграму па развіцці атамнай энергетыкі мае Кітай. Пра гэта паведаміў намеснік генеральнага дырэктара Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Аляксандр Бычкоў. Сёлета КНР ужо запусціла адзін рэактар. Да канца 2014-га кітайцы маюць намер запусціць яшчэ чатыры рэактары і пачаць будаваць пяць новых. Намеснік генеральнага дырэктара МАГАТЭ прывёў такую статыстыку: сёння ў свеце будуюцца 72 энергаблокі — гэта на 10 больш, чым у 2013 годзе. З гэтых 72-х у Кітаі ўзводзіцца 28 энергаблокаў, у Расіі — 10.

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАПА ФРАНЦЫСК ЛІЧЫЦЬ МАФІЁЗІ АДЛУЧАНЫМІ АД ЦАРКВЫ



Звяртаючыся ў ходзе імшы на адкрытым паветры да членаў калабрыйскага мафіёзнага клана Ндрангета, пантыфік заявіў, што яны «пакланяюцца злу» і таму павінны лічыць сябе адлучанымі ад Царквы. Папа Францыск і раней выступаў з асуджэннем арганізаванай злачыннасці і карупцыі. У суботу, выступаючы перад дзясяткамі тысяч жыхароў Калабрыі, самага беднага рэгіёна Італіі, ён сказаў, што Ндрангета ўвасабляе «пакланенне злу і знявагу дабра». «Тыя, хто ў сваім жыцці стаў на гэты шлях зла і сталі мафіёзі, адлучаны ад Бога, адлучаны ад Царквы», — дадаў Папа Рымскі. Ндрангета, Неапалітанская Камора і сіцылійскія Коза Ностра складаюць аснову арганізаванай злачыннасці ў Італіі. Менавіта Калабрыйская мафія кантралюе італьянскі какаінавы рынак, праз яе ажыццяўляецца большасць паставак какаіну ў Еўропу. Пасля такіх заяў Папы Рымскага ўзнікла асцярога — як бы мафія не вырашыла адпомсціць пантыфіку.

### КОРАТКА

Міністэрства прамысловасці Беларусі лічыць далейшую работу па падрыхтоўцы нарматыўнага дакумента аб увядзенні інстытута спецімпарцёраў немэтазгоднай. «Увядзенне спецімпарцёраў у далейшым не плануецца», — адзначылі спецыялісты ведамства.

Фестываль нямога кіно пад адкрытым небам упершыню пройдзе ў Гродне. На тры вечары 27-29 чэрвеня ўнутраны двор Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі ператворыцца ў кінатэатр пад адкрытым небам.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**26 чэрвеня 2014 года ў 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца заключнае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Жыццялюбы

## «ІМКНУСЯ ВЫКАРЧАВАЦЬ З СЯБЕ ГАРАДЖАНІНА»



**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

***Уладзімір Шаблінскі ў юнацтве спяваў у панк-групе «Шабаш», быў дыджэем на радыё «Бі-эй», дырэктарам культавага гурта N.R.M.***

**10 гадоў таму заснавальнік канцэртнага агенцтва «Лінія гуку» Уладзімір Шаблінскі прадаў свой старэнькі «Паджэра» і набыў драўляны дом у Валожынскім раёне. Менавіта там, на хутары Шаблі, які славіцца сваімі фестывалямі «The Beatles» і «Вольнае паветра», былы мінчанін знайшоў самае галоўнае...**

### «ПАЧЫНАЮ ЗАБЫВАЦЬ, ЯК ЦЮКАЦЬ ПА КЛАВІЯТУРЫ»

Па дарозе на хутар Уладзімір шчыра прызнаўся, што пераязджаць з горада ён ніколі не планаваў. «Больш за тое (удакладняе), калі б мне раней сказалі, што буду жыць у вёсцы, — я толькі б пасмяяўся. Жыццё, якое, хутчэй, нагадвала бег па замкнёным коле, мяне цалкам задавальняла. Дакладней, за бясконцымі канцэртнымі заламі ды начнымі клубамі, дзе я арганізоўваў гастролі «зорак», зусім не задумваўся пра галоўнае».

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 57 000 | 171 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 51 300 | 153 900 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 125 000 | 375 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 112 500 | 337 500 |

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА ВАЙСКОЎЦАЎ

**Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Беларусі (ДТСААФ) павінна стаць магутнай грамадскай альтэрнатывай Міністэрству абароны.**

Такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка, наведваючы Мінскі аэраклуб, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт пабываў на авіяцыйна-спартыўным свяце, прысвечаным 80-годдзю з дня ўтварэння Мінскага аэраклуба ДТСААФ і 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кіраўнік дзяржавы агледзеў Музей авіяцыйнай тэхнікі, на дэманстрацыйных пляцоўках былі прадстаўлены тэхнічныя віды спорту, якія развівае ДТСААФ. Прэзідэнт пагутарыў з лётчыкамі ДТСААФ і ветэранамі аэраклуба, а таксама лётчыкамі-касманаўтамі Пятром Клімуком і Алегам Навіцкім, лётчыкамі-выпрабавальнікамі Віктарам Пугачовым і Яўгенам Фраловым, расійскім артыстам Леанідам Якубовічам, якія прыбылі на свята.

ДТСААФ налічвае ў сваіх шэрагах больш за 115 тыс. чалавек і развівае 19 тэхнічных, авіяцыйных і ваенна-прыкладных відаў спорту. У пяці спецыялізаваных дзіцяча-юнацкіх спартыўна-тэхнічных школах ДТСААФ праводзіцца падрыхтоўка спартыўнага рэзерву для папаўнення нацыянальных і зборных камандаў Беларусі. За 2013 ДТСААФ атрымала даход ад усіх відаў дзейнасці ў памеры Br262 млрд. Мінулы год таварыства завяршыла без стратных структур і арганізацый.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ДТСААФ павінна станавіцца моцнай арганізацыяй, якая дапамагае рыхтаваць кадры, у тым ліку для Міністэрства абароны. Кіраўніку дзяржавы быў прадстаўлены перспектыўны план развіцця аэрадрома Ліпкі. Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць праекты па развіцці гэтай тэрыторыі, звярнуўшы ўвагу на тое, што ўсё павінна быць кампактна.

# ВЫРАЗНЫ ГОЛАС ДЗЯЦЕЙ






*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нашы дзеці часам могуць сказаць лепш за дарослых, — адзначыў на адкрыцці выставы старшыня КДБ Беларусі Валерый ВАКУЛЬЧЫК. — Спадзяёмся, што голас дзяўчынак і хлопчыкаў — такі ясны, чысты, праўдзівы, душэўны — дойдзе да сэрцаў палітыкаў і нагадае ім пра важнасць рашэнняў, якія яны прымаюць. Сваімі малюнкамі дзеці выказваюць уласнае стаўленне да навакольнага свету, прызначэння чалавека — рабіць гэты свет лепей. Ніхто не скажа гэта лепш, чым дзеці. Іх малюнкі нікога не могуць пакінуць абыякавымі... Няхай задумаюцца дарослыя, палітыкі, няхай яны змогуць дамовіцца. Няхай будуць шчаслівымі нашы дзеці. Тады мы будзем лічыць, што гэты праект дасягнуў мэты.

...Аліна Чырко з Магілёва любіць не толькі іграць на цымбалах, але і маляваць прыгожую прыроду. Дзяўчынцы вельмі падабаюцца смаўжы, якіх якраз можна пабачыць на адным з малюнкаў. Самыя нетаропкія і спакойныя істоты на прыгожым лісці — хіба не мастацкае ўвасабленне свету?

Першае месца сярод беларускіх работ журы прысудзіла Елізавеце Сухоцкай з Гродна, другое — Кацярыне Рашацько з Гомеля, трэцяе — у Аляксея Мальца з Мінска. Елізавета намалявала дуб як сімвал жыцця, дзе кожны лісток уяўляе сабой сцяг якой-небудзь краіны, а на кожным лісціку на розных мовах пазначана слова «дружба».

Першае месца сярод азербайджанскіх работ — у Захры Мамедавай, другое — у Фідан Ніфталіевай і трэцяе — у Гусейнлі Лейлі. Захра намалявала людзей розных нацыянальнасцяў і рас, якія стаяць на планеце ў промнях сонца, узяўшыся за рукі.

— Для мяне важна, каб нашы дзеці ніколі не адчулі нацыянальны боль, каб яны не ведалі, што такое вайна, — адзначыў на мерапрыемстве Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджана Ісфандзіяр Бахціяр аглы Вагабзадэ.

Арганізатары конкурсу ўзнагародзілі пераможцаў каштоўнымі падарункамі. Далей адбылося выступленне дзіцячых творчых калектываў з Беларусі, дэманстрацыя калекцый студыі дзіцячай моды ад гасцей з Азербайджана. Школьнікі таксама пабывалі ў Белавежскай пушчы, а ў ноч з 21 на 22 чэрвеня наведалі Брэсцкую крэпасць, дзе адбылася рэстаўрацыя падзей пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# «ВЫПРАБАВАННЕ НА ТРЫВАЛАСЦЬ НАШАЙ ПЕРАМОГІ»

1944-2014 70 гадоў вызвалення

## У Брэсце адбылася 46-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі

**Чарговая сесія Парламенцкага сходу саюзных дзяржаў прайшла пад знакам 70-годдзя вызвалення Беларусі і такой жа даты перамогі над фашызмам, якую мы адзначым налета. Гэтую тэму не маглі абысці ўдзельнікі сесіі, у якім бы мерапрыемстве яны ні ўдзельнічалі. Так было і падчас адкрыцця Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Брэсце. Гэта ўжо 60-ы цэнтр, створаны Расіяй у замежных краінах. Такія цэнтры звычайна знаёмяць з жыццём іншых, далёкіх або мала вядомых краін.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

— Але тут зусім іншы выпадак, — сказаў пры адкрыцці цэнтра **старшыня Дзяржаўнай Думы Расіі Сяргей НАРЫШКІН,** — і не толькі таму, што беларусы і расіяне добра ведаюць і, магчыма, як ніхто разумеюць адно аднаго. Мы сапраўды самыя блізкія, брацкія краіны, нас не раздзяляюць ні моўны бар'ер, ні памежныя фармальнасці. Нас аб'ядноўваюць духоўныя і культурныя каштоўнасці, а таксама агульная гістарычная памяць.

Старшыня Дзярждумы выказаў упэўненасць, што новы расійскі цэнтр паслужыць развіццю і памнажэнню гэтага багацця.

А **кіраўнік Рассупрацоўніцтва Канстанцін КАСАЧОЎ** падкрэсліў, што стварэнне цэнтраў азначае якасна новы этап супрацоўніцтва, калі дзяржавы пераходзяць ад дэманстрацыі сцягоў на ўзроўні сталіц да рэальнай штодзённай работы на гуманітарнай прасторы. На думку стваральнікаў, цэнтр будзе цікавы для прафесіяналаў (выкладчыкі рускай мовы тут змогуць павысіць сваю кваліфікацыю), а таксама для ўсіх, хто займаецца развіццём адносін паміж дзвюма дзяржавамі ў адукацыі, навуцы, культуры і іншых сферах гуманітарнага характару.

Расійскі цэнтр навукі і культуры размясціўся ў дзелавой частцы Брэста. Тут ёсць вялікая бібліятэка з чытальнай залай, месца для правядзення выстаў, творчых, навуковых сустрэч. Падчас яго адкрыцця **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР** зазначыў, што ў вобласці пражываюць людзі прыкладна 70 нацыянальнасцяў, сем працэнтаў складаюць рускія. Улада на месцы робіць усё, каб людзі адчувалі сябе камфортна, маглі развіваць сваю нацыянальную культуру і адукацыю. Наш агульны добрасуседскі клопат аб гэтым сёння — залог захавання міру і спакою, — адзначыў губернатар.

— У гады вайны мы былі разам, мы і сёння разам — сказаў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**.

Ён падкрэсліў, што рашэнні 46-й сесіі Парламенцкага сходу — гэта працяг выпрабаванняў на трываласць нашай агульнай Перамогі.

Асноўным пытаннем парадку дня сесіі стаў ход рэалізацыі мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Частка з іх ужо рэалізавана. Гэта помнікі ў гонар падзей вайны на тэрыторыі Беларусі і Расіі, якія фінансаваліся з Саюзнага бюджэту, розныя фестывалі і конкурсы. Важнейшымі складнікамі з'яўляюцца выхаванне моладзі на праўдзівай гісторыі і стварэнне камфортных умоў для ветэранаў. Напрыклад, кадэты і суворaўцы дзвюх краін пастаянна адпачываюць і выхоўваюцца ў тэматычных лагерах адпачынку. Вось і сёлета 400 курсантаў адпаведных навучальных устаноў Беларусі і Расіі пройдуць курс аздараўлення ў Анапе і летніку «Зубраня» пад Мінскам. Па так званай «саюзнай пуцёўцы» прайшлі курс лячэння і аздараўлення больш за 6,5 тысячы ветэранаў у перыяд з 2010 года. Сёлета пуцёўку ў санаторыі адной і другой краіны ўжо атрымалі 750 ветэранаў.

Сярод удалых праектаў і сумесны расійска-беларускі фільм «Брэсцкая крэпасць», створаны пры падтрымцы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Яго прэм'ера адбылася ў Брэсцкай крэпасці ў ноч на 22 чэрвеня 2010 года. Фільм выканаў сваю сацыяльную задачу: ён стаў магутным прапагандысцкім інструментам у справе сцвярджэння праўды аб вайне. На сесіі выступіў **кіраўнік тэлерадыёкампаніі Саюзнай дзяржавы Ігар УГОЛЬНІКАЎ.** Ён зноў прасіў падтрымкі Парламенцкага сходу, бо запускаецца новы праект — сумесны фільм аб Першай сусветнай вайне. Паводле слоў Ігара Угольнікава, фільм павінен закрыць інфармацыйную прарэху — асабліва ў свядомасці маладога пакалення. Бо тая вайна даўно стала для нас вайной невядомай. А колькі было прадэманстравана ўзораў мужнасці і гераізму на палях Першай сусветнай!

Фільм-эпапея адлюструе Брусілаўскі прарыў і іншыя знакавыя эпізоды вайны, якая пакінула на нашай зямлі вялікі след. Стваральнікі фільма спадзяюцца зрабіць кінастужку па ўзору папярэдняй з улікам памылак і хібаў мінулай работы. Першапачатковы каштарыс бюджэту фільма скарочаны на 35 працэнтаў. Аўтары адмовіліся ад здымак за мяжой Саюзнай дзяржавы. А ў дэпутатаў прасілі не толькі матэрыяльнай, але і арганізацыйнай падтрымкі. Прапановы перададзены ў Савет Парламенцкага сходу. Канчатковае рашэнне, хутчэй за ўсё, будзе прынята на наступнай сесіі.

А брэсцкая сесія разгледзела вынікі работы сходу ў 2013 годзе і шэраг іншых пытанняў. На выніковым брыфінгу былі закрануты пытанні дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза. Сяргей Нарышкін сказаў, што парламенты Беларусі і Расіі маюць намер ратыфікаваць дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе ўжо на асенняй сесіі. «Мы настроена на тое, што зробім гэта сінхронна з казахстанскімі сябрамі», — сказаў спікер Расійскай Дзярждумы.

Сесія завяршыла сваю работу вечарам 21 чэрвеня. А ў чатыры гадзіны раніцы наступнага дня дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ўзялі ўдзел у мітынгу-рэквіеме на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, які традыцыйна праходзіць у гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СВЕТУ НЕ ПАТРЭБНА ВАЙНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цягнік памяці прывёз ветэранаў, моладзь, людзей сярэдняга пакалення з Расіі. Тыя з іх, хто быў тут першы раз, адзначаюць асаблівую моц гэтага мерапрыемства. Можа, таму, што праходзіць яно а чацвёртай раніцы, а людзі збіраюцца яшчэ раней, калі над крэпасцю стаіць цемра, а цішыню не парушаюць нават птушкі. А потым з дынамікаў пачынаюць раўці сірэны, раздаюцца гукі выбухаў і пякельны свіст куль. І такі знаёмы голас Левітана паведамляе аб вайне...

Сёлета да памятнага мітынгу прымеркавалі адкрыццё новага музея ў былой казарме Брэсцкай крэпасці. Восем залаў з экспазіцыямі расказваюць аб новых эпізодах у гісторыі абароны і лёсах абаронцаў. Адным са знакавых экспанатаў стаў асабісты дзённік лейтэнанта Сяргея Перадзельскага, які передалі музею з Бранскай вобласці родныя абаронцы цытадэлі. Музей стаў нашым яшчэ адным агульным культурным здабыткам, бо ў фінансаванні праекта ўзяў удзел расійскі «Газпрам».

Традыцыйную стужку падчас адкрыцця музея пад назвай «Музей вайны — тэрыторыя міру» перарэзалі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР, міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ, намеснік старшыні праўлення расійскага ААТ «Газпрам» Віталь МАРКЕЛАЎ. На адкрыцці экспазіцыі былі таксама дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**




# ЗВОН СМУТКУ



**У Магілёве ён празвінеў у дзень пачатку Другой сусветнай вайны.**

Каля тысячы жыхароў Магілёва падтрымалі маладзёжную патрыятычную акцыю «Звон смутку», прысвечаную Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Прадстаўнікі ўлады, грамадскіх аб'яднанняў, Праваслаўнай Царквы; ветэраны, моладзь прыйшлі а чацвёртай гадзіне раніцы на мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле», каб аддаць даніну памяці тым, хто паклаў свае жыцці на алтар Перамогі. Па традыцыі ўдзельнікі мерапрыемства апусцілі на ваду вянок і кветкі — як сімвал пакланення перад подзвігам герояў. У гонар пераможцаў прагучалі тры ружэйныя стрэлы, а ў неба было запушчана 70 паветраных шароў, у кожным з якіх знаходзілася пасланне з пажаданнямі міру і дабра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЗНАК ПАМЯЦІ,

## прысвечаны вызваленчай аперацыі «Баграціён», адкрыты ля вёскі Раковічы ў Светлагорскім раёне

**Менавіта ў гэтым месцы, побач з сённяшняй шашой Бабруйск — Мазыр, 70 гадоў таму пачалася ваенная аперацыя савецкіх войскаў, якая завяршылася поўным вызваленнем Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта сёння тут жытняе поле, а ў 1944 годзе былі непраходныя балоты. Абысці балотамі добра ўмацаваныя пазіцыі вермахта — задача, якую вайскоўцы змаглі вырашыць у самыя сціслыя тэрміны. За два месяцы аперацыі «Баграціён» было паранена 600 тысяч савецкіх салдатаў, а яшчэ 180 тысяч паклалі свае жыцці на алтар Перамогі.**




Фота БЕЛТА.

Вышыня памятнага знака — 7 метраў. У цэнтры барэльефа — фігуры чатырох палкаводцаў: Канстанціна Ракасоўскага, Георгія Жукава, Паўла Батава і Міхаіла Панова. Справа і злева — савецкія воіны. Фонам сталі стрэлы-кірункі двух галоўных удараў. Манумент узведзены ў асноўным за кошт сродкаў бюджэту Саюзнай дзяржавы. Адным з ініцыятараў яго стварэння стаў сённяшні старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон, які адзначыў на адкрыцці, што помнік атрымаўся проста раскошны. Шмат намаганняў, каб на гэтай зямлі з'явіўся помнік пераможцам, прыклаў светлагорскі паэт Ізяслаў Катляроў:

— Такая падзея магла адбыцца толькі ў краіне, якая вельмі натуральна жыве пераемнасцю патрыятычных традыцый савецкага народа. Важна, каб усё мела працяг. Каб быў не толькі мемарыяльны знак, але і мемарыяльны комплекс, прысвечаны аперацыі «Баграціён». Трэба ўзвесці музей, капліцу, аднавіць камандны пункт Батава, фрагменты гацяў і траншэй... Актуальнасць відавочная. Сёння зневажаецца сама сутнасць нашай Перамогі, разбураюцца помнікі і мемарыялы ў блізкім і далёкім замежжы. У Маскве адбылася канферэнцыя заснавальнікаў грамадскага руху Саюз абаронцаў памяці Вялікай Айчыннай вайны, мэта якой — абараніць памяць і праўду аб вайне. Я ўпэўнены, што такую ж грамадскую арганізацыю можна і трэба стварыць у нас у Беларусі, а потым аб'яднаць нашы намаганні з расіянамі пад спагадлівай увагай Саюзнай дзяржавы.

На тэрыторыі мемарыяла плануецца адкрыць музейны комплекс, прысвечаны аперацыі «Баграціён», а таксама аднавіць бліндажы і фрагменты ваенна-інжынерных перапраў, размясціць узоры баявой тэхнікі і зброі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# «МУЗЕЙ-БУС» У КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦЫ

**22 чэрвеня ў Гродна прыбыў маладзёжны марафон «70!». Галоўны сімвал гэтага праекта БРСМ, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (перасовачная выстава «Музей-бус»), размясціўся ў парку Жылібера.**




Акцыя распачалася з мітынга-рэквіема каля Вечнага агню, пасля чаго жыхары і госці горада змаглі азнаёміцца з экспанатамі перасоўнага музея — зброяй, форменным адзеннем, прадметамі армейскага побыту. Дарэчы, у Гродне экспазіцыя папоўнілася рарытэтамі ваенных часоў, сярод якіх прыстасаванні для захоўвання тэлескопа і процівагаза, а таксама нямецкая трафейная сумка з цялячай скуры для важных дакументаў, на якой і сёння відаць прозвішча яе былога ўладальніка.

Актывісты БРСМ арганізавалі на тэрыторыі парку некалькі тэматычных пляцовак. На адной з іх праводзілася гістарычная рэканструкцыя агітбрыгады часоў Вялікай Айчыннай — з выкананнем песень пра вайну, чытаннем трохвугольных «пісьмаў з фронту». На іншай пляцоўцы разгарнуў работу перавязачны пункт палявой медсанчасці — тут вучылі аказваць першую медыцынскую дапамогу, а таксама ўдзельнічаць у эстафеце па пераносцы на насілках «параненага».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Погляд

# АД РЭСТАРАННАГА БІЗНЕСУ ДА БІЯТЭХНАЛОГІЙ



## Перспектывы развіцця адносін з Азербайджанам

**У пазітыўным развіцці беларуска-азербайджанскіх адносін вялікае значэнне мае агульная савецкая культурная спадчына, з прычыны якой менталітэт у старэйшага пакалення грамадзян Беларусі і Азербайджана не так ужо моцна і адрозніваецца. У гэтым я сам не раз пераканаўся падчас нядаўняга наведвання Азербайджана — зносіны з прадстаўнікамі розных слаёў грамадства аказаліся камфортнымі, усюды былі чуваць песні часоў СССР, а ўставіць цытату з савецкага кінафільма падчас сяброўскай гутаркі для азербайджанцаў цалкам натуральна.**

Добразычлівае стаўленне прадстаўнікоў беларускай нацыі да прадстаўнікоў іншых народаў было азербайджанцамі таксама даўно па заслугах ацэнена — у выніку азербайджанская дыяспара ў Беларусі сёння налічвае 20 тысяч чалавек. Наша краіна стала для азербайджанцаў «сваёй Еўропай» — пры адсутнасці візавых бар'ераў і лёгкасці зносін, Беларусь, тым не менш, з'яўляецца тыповай еўрапейскай краінай, уключаючы стыль жыцця і асаблівасці ўспрымання свету.

Немалаважнае значэнне ў развіцці адносін мае і дружба беларускага кіраўніка як з цяперашнім лідарам Азербайджана, так і з яго бацькам, якія зрабілі вельмі шмат для станаўлення Азербайджана як сучаснай суверэннай дзяржавы. Гэта таксама з'яўляецца падставай для азербайджанцаў развіваць адносіны з нашай краінай па ўсіх кірунках, а таксама аказваць падтрымку ў цяжкія часы.

Пра гэта згадаў і Аляксандр Лукашэнка, прымаючы на мінулым тыдні прэм'ер-міністра Азербайджана Артура Расі-задэ, які прыбыў з высокім візітам. Прэзідэнт сказаў літаральна наступнае: «Азербайджан з'яўляецца для нас адной з прыярытэтных дзяржаў, і мы вельмі добра памятаем тыя часы, калі нам было вельмі складана і цяжка, і вы літаральна на працягу некалькіх дзён падставілі нам плячо». Відавочна, што кіраўнік нашай дзяржавы меў на ўвазе пастаўкі азербайджанскай нафты, якія ажыццяўляліся ў 2011 годзе, і кароткатэрміновы крэдыт для аплаты газу, выдзелены ў 2010 годзе.

У Азербайджане па заслугах ацанілі беларускі прамысловы патэнцыял. На базе Гянджынскага аўтамабільнага завода ажыццяўляецца вытворчасць трактароў «Беларус» і аўтамабіляў МАЗ. Акрамя гэтага, у краіне вядзецца таксама выпуск беларускай камунальнай і сельскагаспадарчай тэхнікі, ліфтавага абсталявання і аптычных прыбораў.

У сваю чаргу Беларусь адкрытая для інвестыцый з боку Азербайджана. Найбольш прыкметнымі былі да нядаўняга часу азербайджанскія інвестыцыі ў рэстаранны бізнес. Іх поспех дапамог стварыць у азербайджанскага боку правільнае ўяўленне аб магчымасці і перспектывах інвеставання ў Беларусь, і цяпер гаворка ідзе ўжо пра будаўніцтва буйнога гандлёва-лагістычнага цэнтра, бізнес-цэнтра, абмяркоўваецца ўзвядзенне гасцініц, вытворчых і сельскагаспадарчых аб'ектаў.

**Інвестары з Азербайджана змогуць паўдзельнічаць у сферы біятэхналогій і фармацэўтыкі, у тым ліку і прыняўшы ўдзел у развіцці Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка.**

Сур'ёзны патэнцыял маюць і іншыя напрамкі, да ўдзелу ў якіх беларускі бок рэгулярна запрашае азербайджанскіх партнёраў. Вядома ж, не могуць не акупіцца інвестыцыі ў IT-праекты, улічваючы, які сур'ёзны прагрэс дэманструе беларускі Парк высокіх тэхналогій, у якім базуюцца ўжо найбуйнейшыя кампаніі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў гэтай сферы.

Вялікі зачын у Беларусі ёсць таксама ў фармацэўтыцы і біятэхналогіях. Ён уключае як існуючыя кампаніі і заводы, так і сур'ёзны навуковы патэнцыял, сканцэнтраваны ў профільных лабараторыях Нацыянальнай акадэміі навук. Інвестары з Азербайджана змогуць паўдзельнічаць у гэтай сферы, у тым ліку і прыняўшы ўдзел у развіцці Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, дзе праектам па гэтых напрамках будзе дадзена зялёнае святло.

Безумоўна, азербайджанскія інвестыцыі могуць прыйсці і ў беларускую нафтахімію. Гэта сфера не чужая і самому Азербайджану, а ў Беларусі ў бліжэйшыя гады ёсць вялікія планы па рэзкім павелічэнні асартыменту прадукцыі, якая выпускаецца на базе магутнага айчыннага нафтахімічнага комплексу.

Ёсць нядрэнныя магчымасці ажыццявіць паспяховыя інвестыцыі ў сферы энергазберажэння. Тут нашай краіне цікавы вопыт Азербайджана ў сувязі з тым, што частка даходаў ад паспяховага экспарту энергарэсурсаў, якія здабываюцца азербайджанцамі, была выдаткавана на ўзвядзенне сучасных будынкаў, эфектыўных у тым ліку і з пункту гледжання энергазберажэння. Пастаянная ўвага беларускай дзяржавы да гэтай тэмы дазволіла стварыць умовы, калі замежныя інвестыцыі пачалі прыходзіць у энергазберажэнне, у тым ліку і ў напрамку развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.

Добра ідуць справы ў нашых краін і ў сферы развіцця тавараабароту. Вядома, да лічбаў 2011 года, калі ў Беларусь пастаўляліся значныя аб'ёмы азербайджанскай нафты, удасца дабрацца не хутка, але ў 2013 годзе тавараабарот прадэманстраваў пазітыўную дынаміку. У параўнанні з 2012-м ён вырас на 40 мільёнаў долараў, дасягнуўшы 265 мільёнаў.

Сёння адна з найбольш цікавых для Азербайджана тэм — як зменяцца беларуска-азербайджанскія адносіны пасля ўтварэння з 2015 года Еўразійскага эканамічнага саюза. Між тым ніякіх асаблівых сенсацыйных змен не будзе — асноўныя правілы па гандлі з трэцімі краінамі ўжо былі закладзены ў дакументах, прынятых пры стварэнні ЕЭП і МС.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Новыя стандарты

# ПАЛЯВАННЕ І РЫБАЛОЎСТВА БЕЗ БРАКАНЬЕРАЎ

**З 26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.**

Як адзначыў **кіраўнік упраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Аляксандр ДРАГУН,** таксы для вызначэння памеру кампенсацыі шкоды наваколлю ад браканьераў павялічаны ў сярэднім у тры разы. Цяпер незаконная здабыча лася ці аленя абыдзецца праваправушальніку ў 300 базавых велічынь, зубра ці мядзведзя — 400 базавых (да гэтага — 95), ментуза — 9 базавых (раней — 3). Прадстаўнік дзяржінспекцыі лічыць, што вялікія штрафы адаб'юць ахвоту да браканьерства ў многіх.

Павялічыліся і змяніліся тэрміны забароны на лоўлю звычайнага шчупака, звычайнага сома, судака. Меры неабходны для аховы гэтых відаў рыбы. Колькасць рыбалоўных кручкоў, якія дазволена выкарыстоўваць аднaчасова, зменшана ў два разы: да 5 штук на аднаго рыбалова-аматара. Унесены змены па арэндзе рыбалоўных угоддзяў: зняты ўсе абмежаванні па іх арэнднай плаце. Тэрмін арэнды павялічаны з 5 да 10 гадоў, раз на пяцігодку ўводзіцца абавязковая акрэдытацыя.

Што датычыцца правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, змянілася працэдура заключэння і скасавання дагавора арэнды паляўнічых угоддзяў. Абавязковай стане акрэдытацыя паляўнічых угоддзяў на права вядзення паляўнічай гаспадаркі.

Для таго, каб атрымаць дзяржаўнае пасведчанне на права палявання, прэтэндэнтам давядзецца праходзіць падрыхтоўчыя курсы для здачы спецыяльнага паляўнічага экзамену. Абавязковым дадаткам да дзяржпасведчання стане картка ўліку правапарушэнняў і выплаты дзяржаўнай пошліны. У выніку парушэння для ўзнаўлення дакументаў давядзецца здаваць экзамен нанава.

Новая тэхналогія — рэалізацыя паляўнічых пуцёвак праз інтэрнэт — таксама стане даступнай з 26 чэрвеня.

**Кацярына РАДЗЮК.**

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 5 (34)





■ Рыхтуемся да свята

# І ПРОЙДЗЕ «ЭПОХА» Ў ПАРАДНЫХ РАЗЛІКАХ...

## УПЕРШЫНЮ ПЕРАД МІНЧАНАМІ І ГАСЦЯМІ СТАЛІЦЫ ПРОЙДУЦЬ «ПАРТЫЗАНЫ», ДЗЯЎЧАТЫ І РЭТРАТЭХНІКА ЧАСОЎ ЯШЧЭ САВЕЦКА-ФІНСКАЙ ВАЙНЫ!

**Лічаныя дні застаюцца да галоўнага свята краіны. Падрыхтоўка да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялася не адзін дзень. Амаль усё насельніцтва замірае ў чаканні цікавых культурных праграм, грандыёзных шоу, захапляльных феерверкаў і, безумоўна, парада.**





Парад традыцыйна застаецца адным з найбольш папулярных аб'ектаў назірання падчас святкавання Дня Незалежнасці.

3 ліпеня перад мінчанамі і гасцямі сталіцы ў парадных разліках пройдзе больш як 3700 вайскоўцаў. Сярод іх выхаванцы Мінскага суворваўскага ваеннага вучылішча, курсанты Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, вайскова-тэхнічнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, ваеннаслужачыя 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады, 38-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады і 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння, а таксама прадстаўнікі злучэнняў і вайсковых часцей войскаў сувязі, роты ганаровай варты, зводнага аркестра Узброеных Сіл. Акрамя таго, у святочным шэсці прымуць удзел парадныя разлікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У парадзе на Дзень Незалежнасці возьмуць удзел і вайскоўцы Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі.

— Удзел у парадзе нашых расійскіх калег стаў ужо добрай традыцыяй,— зазначыў **вайсковы камендант Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь палкоўнік Анатоль ГРЫЦАЎ.** — Сёлета да нас прыехалі пскоўскія дэсантнікі, якія пройдуць у складзе пешай калоны. Акрамя таго, будзе прадстаўлена сучасная ваенная тэхніка Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі: самаходныя пускавыя ўстаноўкі аператыўна-тактычнага ракетнага комплексу «Іскандэр» і зенітнага ракетнага комплексу С-400 «Трыумф», браніраваныя шматмэтавыя аўтамабілі «Тыгр».

Па традыцыі першымі адкрыюць парад самыя юныя яго ўдзельнікі — мінскія суворваўцы. У прыгожай чорнай форме з чырвонымі пагонамі і белымі папругамі яны не толькі будуць сінхронна ісці, трымаючы раўненне, а і адначасова біць у барабаны, чым зададуць тон усяму шэсцю.

Старшыя віцэ-сяржанты Віктар Агееў і Максім Голікаў у парадзе возьмуць удзел другі раз. Віця асабліва не хвалюецца, лічыць, што пэўны вопыт ужо ёсць, таму не так страшна. А вось Максім перажывае больш, чым у мінулы раз.

— Ужо ведаеш, што такое парад, як гэта адказна,— прызнаецца падлетак.— А мы — правафланговыя, лічы, ва ўсіх на вачах.

На рэпетыцыю Кірыл Тамкоў прыехаў з Брэста. 38-я асобная гвардзейская мабільная брыгада, дзе праходзіць тэрміновую службу юнак,— традыцыйная ўдзельніца парада. З 12 мая вайскоўцы адточваюць страявую, вучацца трымаць дыстанцыю.

— Браць удзел у парадзе для мяне — вялікі гонар,— прызнаецца камандзір аддзялення.— Гэта захаванне традыцый, удзячнасць нашым продкам за Перамогу. Мае абодва дзяды ваявалі на фронце. Пётр Дайнэка (дзядуля па маці) — кулямётчык, удзельнічаў у Сталінградскай бітве, там жа яго паранілі. Дзед па бацьку, Уладзімір Тамкоў, быў адзначаны шматлікімі ўзнагародамі за подзвігі ў тыле. На жаль, дзядоў ужо няма ў жывых. Але я ўпэўнены, яны б мной ганарыліся.

А вось курсанту 3-га курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Руслану Чаранкевічу пашанцавала больш: яго дзед, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ, як той казаў, у страі. Парад будзе глядзець абавязкова, праўда, па тэлебачанні. І не ён адзін: усе суседзі ведаюць, што ўнук былога франтавіка ў парадзе будзе ўдзельнічаць ужо трэці раз.

— Вялікі гонар прайсці ва «франтавой» каробцы, якую прадстаўляе 150 курсантаў акадэміі,— расказвае Руслан.— Дзед ваяваў у складзе 2-га Беларускага фронту, артылерыст. Атрымаў медалі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна». Гледзячы на мяне, апранутага ў форму тых часоў, ён успомніць сябе маладога, сваіх таварышаў, якім не пашчасціла вярнуцца з вайны…

Знамя Перамогі і штандары 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх франтоў, а таксама 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія пранясуць перад трыбунамі, нагадаюць і пра Беларускую стратэгічную наступальную аперацыю «Баграціён», у ходзе якой была вызвалена беларуская сталіца.

Усяго ў парадзе прыме ўдзел 20 пешых калон. Кожная «каробка» адметная сваёй формай адзення. Упершыню на сталічным праспекце з'явіцца калона «партызанаў». У адпаведнай экіпіроўцы, з унікальнымі ўзорамі рарытэтнай зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны яны пройдуць, як іх продкі 70 гадоў таму. Форму тых часоў арандавалі на «Беларусьфільме». Афіцэры Ваеннай акадэміі пройдуць, трымаючы ў руках вінтоўкі Мосіна, карабіны, ППШ, кулямёты Дзегцярова, трафейную зброю… У «партызанскай» каробцы можна будзе заўважыць і дзяўчат. І невыпадкова: колькі нашых маці, бабуль, прабабуль уступалі ва ўсенародную барацьбу! Дарэчы, дагэтуль прадстаўніцы лепшай паловы чалавецтва ў парадзе ніколі не ўдзельнічалі.

— Увогуле без жанчын на Зямлі цяжка,— перакананая **выкладчыца кафедры інфармацыйна-вылічальных сістэм Ваеннай акадэміі, выпускніца ўстановы капітан Іна ГЕРМАНОВІЧ.** — На фронце жанчыны ў асноўным былі сувязісткамі. А сувязь — кіраванне. Яны абаранялі сваю Радзіму, сваіх дзяцей. Нездарма кажуць, калі страшна, колькасць смельчакоў павялічваецца. Якраз страх, напэўна, і прымусіў забыць, што яны жанчыны. Многіх з іх ужо няма. А для тых, хто яшчэ жыве, наш удзел у парадзе будзе напамінам іх маладосці, удзячнасцю за іх неймаверныя подзвігі, часам непасільныя для некаторых мужчын.

Самае цікавае ў парадзе — ваенная тэхніка. Унікальная магчымасць ацаніць баявы патэнцыял беларускай арміі! Многія і прыходзяць на парад, каб пабачыць усё на свае вочы. Сёлета ў парадзе будзе задзейнічана каля 240 адзінак баявой тэхнікі. Беларускай і расійскай, сучаснай і рарытэтнай, знаёмай і той, якая будзе тут прадстаўлена ўпершыню. Агульная працягласць механізаванага



**Сёлета ў парадзе будзе задзейнічана каля 240 адзінак баявой тэхнікі. Беларускай і расійскай, сучаснай і рарытэтнай, знаёмай і той, якая будзе тут прадстаўлена ўпершыню. Агульная працягласць механізаванага параднага разліку — больш чым 1500 метраў.**







параднага разліку — больш чым 1500 метраў.

— Цяперашні год з'яўляецца юбілейным, таму склад механізаванай калоны пашыраны,— паведаміў **намеснік начальніка ўзбраення Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Андрэй ФЕДЗІН.** — У яе ўваходзяць усе асноўныя ўзоры ўзбраення, якія знаходзяцца на аснашчэнні воінскіх часцей і злучэнняў Рэспублікі Беларусь, ваенная тэхніка Расійскай Федэрацыі. Машыны расстаўлены такім чынам, каб парад глядзеўся эстэтычна. Зыходзячы з іх габарытаў, вызначаецца, колькі іх будзе ў адной шарэнзе: тры ці дзве. Спачатку ідзе бранятанкавае ўзбраенне і тэхніка, затым тэхніка сіл спецыяльных аперацый, ракетных войскаў і артылерыі, замыкае калону тэхніка войскаў супрацьпаветранай абароны. Галоўнае, каб накіроўваючыя задалі тон і неабходную хуткасць руху, тады ўсё пройдзе выдатна.

Адкрые механізаваную калону тэхніка Вялікай Айчыннай вайны. Дарэчы, рарытэтаў сёлета будзе надзвычай шмат. Тэхніка першага перыяду вайны — танкі Т-37 і Т-60 — ваявала яшчэ ў фінскай вайне. Іх прывезлі па дамоўленасці з прыватным музеем тэхнікі Вадзіма Задарожнага, які знаходзіцца ў Маскве.

— Т-60 — машына, якая знаходзілася на ўзбраенні савецкіх войскаў у першы перыяд вайны, адзін з самых масавых танкаў у тыя гады,— расказаў **супрацоўнік музея тэхнікі В. Задарожнага Андрэй ХРАПАЎ.** — Гэтыя танкі суправаджалі пяхоту, падтрымліваючы яе бранёй і агнём. Экіпаж — два чалавекі: механік-кіроўца і камандзір танка, ён жа наводчык гарматы і зараджальнік. Па сутнасці, гэта невялікая, але дастаткова грозная машына для свайго часу. На ёй ваявалі нават пад Курскай дугой. Напрыклад, у складзе 1-й танкавай арміі Катукова налічвалася 15 такіх танкаў. У нашым музеі іх шэсць, і ўсе яны ўдзельнічаюць у штогадовых парадах у Маскве.

Завершыцца ўрачыстае шэсце на Дзень Незалежнасці пляц-канцэртам зводнай роты ганаровай варты і выступленнем зводнага ваеннага аркестра. Больш за сотню чалавек прадэманструюць новыя элементы і перастраенні. Як расказаў **камандзір зводнай роты ганаровай варты капітан Павел ШПАРЛА,** іх выступленне будзе доўжыцца каля 7 хвілін. «Пляц-канцэрт пабудаваны такім чынам, што ў гледачоў з'явіцца магчымасць убачыць яго з абодвух бакоў,— раскрыў галоўны сакрэт юнак.— Дзеянне адбудзецца пад песні аб Беларусі, якія ведае амаль увесь свет. Можна смела казаць, што сёлета, ідучы на пляц-канцэрт, людзі трапяць на своеасаблівае шоу!»

Парад пройдзе і ў мінскім небе. Паветраны «эшалон» складуць асноўныя тыпы авіяцыйнай тэхнікі беларускай арміі. Увечары неба над Мінскам упрыгожыць святочны салют з 30 залпаў. Арганізатары запэўніваюць, што ён будзе дастаткова маляўнічым і асаблівым. А мы пажывём — паглядзім. Каму ўжо вельмі карціць, то ёсць магчымасць папрысутнічаць на генеральных рэпетыцыях парада, якія адбудуцца ў Мінску 26 і 28 чэрвеня.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і Любові БЯЛЯЕВАЙ**

■ Адмысловыя сустрэчы

# Выбар народа

## Кніжную скарбонку краіны папоўніў новы зборнік публіцыстыкі

**«Выбар беларускага народа — прарыў у будучыню» — кніга Уладзіміра Макарава, якая ўбачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Каб павіншаваць аўтара з дэбютам, падчас прэзентацыі твора ў Цэнтральнай бібліятэцы Узброеных Сіл сабраліся калегі і аднадумцы.**

Як публіцыста Уладзіміра Макарава ведаюць нямногія. Усё больш на слыху яго штодзённая дзейнасць: начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь годна нясе афіцэрскую службу, рэгулярна выступае на шматлікіх канферэнцыях і семінарах, на працягу доўгага часу публікуецца ў беларускім перыядычным друку.

Менавіта артыкулы апошніх 10 гадоў, якія былі надрукаваны ў грамадска-палітычных газетах і навуковых часопісах, увайшлі ў кнігу. Такім чынам і атрымаўся зборнік публіцыстыкі. Актуальнай, надзённай, дзесьці вострай і нават палемічнай. А інакш і быць не магло.

— Як рэдактар прызнаюся, што з Уладзімірам Макаравым даволі складана працаваць,— зазначыў **Вадзім ГІГІН, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка»,** дзе і былі апублікаваны многія творы аўтара.— Ён згаджаецца выступіць з артыкулам толькі пры ўмове, што тэма яму блізкая і цікавая. А калі ўжо пагадзіўся, то б'ецца за кожны свой тэзіс, літаральна за кожную коску. Але і вынік уражвае! У гэтага аўтара не бывае «прахадных» публікацый. Усе яны выклікаюць жывую чытацкую цікавасць. З імі можна згаджацца ці спрачацца, але ў гэтых артыкулах ёсць галоўнае — яны не пакідаюць абыякавымі.

Як прызнаўся Уладзімір Макараў, ідэя выдання кнігі належыць не яму. «Я б сам не адважыўся»,— перакананы ён. Стварыць падобны зборнік прапанавалі аўтару ў студыі ваенных пісьменнікаў, яе кіраўнік Яўген Каршукоў. Падтрымалі і ў Саюзе пісьменнікаў. Тым больш што напрацовак хапала: больш за 100 публікацый, у тым ліку за 30 — у навуковых часопісах. Заставалася толькі адабраць найбольш вартыя чытацкай увагі, усё сістэматызаваць. У выніку ў кнігу ўвайшлі 32 артыкулы. «Некаторыя былі такімі крутымі і вострымі, што перачытваючы іх яшчэ раз, здзіўляўся, што мог такое напісаць»,— прызнаўся Уладзімір Мацвеевіч.




Як адзначыў **лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, пісьменнік Алесь САВІЦКІ,** кніга вельмі патрэбна сёння. «Яна патрэбна студэнтам, простаму чытачу і асабліва чалавеку вайсковаму,— лічыць ветэран Вялікай Айчыннай вайны.— Кніга знойдзе не толькі водгук у грамадстве, яна дапаможа яму быць яшчэ больш духоўна ўзброеным, больш смелым у вызначэнні сваёй грамадзянскай пазіцыі і мужнасці. Калі сапраўды па біблейскім сказанні «в начале было Слово», то, мне думаецца, і ў канцы таксама будзе яно. Толькі яно, звернутае да людскіх душ, слова праўды, слова мужнае дапаможа чалавеку ўстаяць у гэтым змаганні і ніколі не памыліцца і ў сваім выбары, і ў далейшай барацьбе. Няхай гэтае слова дойдзе да чытача, да грамадзяніна і асабліва да маладога пакалення, якому разбірацца ў сённяшніх складаных сітуацыях вельмі-вельмі цяжка. А кніга — надзейны арыенцір. Глыбокі, філасофскі, разумны і, галоўнае, не назойлівы, які дапамагае паверыць у сябе, у тую ідэю, якую ён верыць сам, і тую, што ажыццяўляюць яго паплечнікі».

